# Прэзідэнт сустрэўся з С.Лінгам

***Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка 21 красавіка 1999 года прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С.С.Лінга.***

Кіраўнік дзяржавы заслухаў інфармацыю аб ходзе выканання даручэнняў, дадзеных ім раней ураду, паведаміла прэс-служба Прэзідэнта. Даволі значнае месца ў гутарцы з С.С.Лінгам было адведзена пытанням аплаты працы. У сувязі з тым, што індэксацыйныя меры не поўнасцю кампенсуюць страты ад павышэння цэн на тавары, па ўказанню Прэзідэнта ўрадам распрацаваны і ўнесены прапановы аб павелічэнні мінімальнай заработнай платы і стаўкі першага разраду з мэтай не дапусціць зніжэння даходаў насельніцтва. Гэта мера, адобраная Прэзідэнтам, будзе ўведзена пастановай урада з 1 мая.

Прэм'ер-міністр праінфармаваў кіраўніка дзяржавы таксама аб ходзе рэалізацыі паставак беларускіх трактароў у Туркменістан у адпаведнасці з дамоўленасцю прэзідэнтаў абедзвюх краін.

С.С.Лінг інфармаваў аб пазіцыі ўрада адносна далейшага функцыяніравання акцыянернага таварыства з удзелам "Славнафты" і Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода.

У ходзе сустрэчы былі разгледжаны некаторыя кадравыя пытанні.

**БЕЛТА.**